**ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ**
**ў Гродне**




# НЕАРДЫНАРНАЯ ПАДЗЕЯ




**19 лютага па запрашэнні Гродзенскай сярэдняй школы № 40 імя В. І. Крэмко тут перад старшакласнікамі выступіла беларуская паэтэса Людміла КЕБІЧ. Сустрэча была прысвечана Сусветнаму дню роднай мовы.**

Сустрэча з пісьменнікам – гэта неардынарная падзея, якая абавязкова застанецца ў памяці кожнага.

У панядзелак, 19 лютага 2024 года для вучняў 7-х класаў ДУА «Сярэдняя школа № 40 г. Гродна імя В. І. Крэмко» ў літаратурнай гасцёўні прайшла сустрэча з гродзенскай паэтэсай, празаікам і публіцыстам, ганаровым членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшынёй Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людмілай Антонаўнай Кебіч.

Паэтэса адразу наладзіла са школьнікамі кантакт, бо добра ведае, што цікавіць сучасных школьнікаў. Людміла Антонаўна чытала вершы, жарты, загадкі, адказвала на пытанні слухачоў, таму добразычлівая атмасфера і задавальненне віталі ў час сустрэчы ў літаратурнай гасцёўні.

**Тэлеграм-канал**
**СШ № 40 г. Гродна імя В. І. Крэмко**

**На фота:** Людміла Кебіч у гасцях у вучняў ДУА «Сярэдняя школа № 40 г. Гродна імя В. І. Крэмко». 19 лютага 2024 года.




СВЯТЛО РОДНАГА СЛОВА


СВЯТЛО РОДНАГА СЛОВА
Янка КУПАЛА (Іван Луцэвіч) (1882 - 1942 гг.)
Якуб КОЛАС
(1882 - 1956 гг.)
Уладзімір КАРАТКЕВІЧ (1930 - 1984 гг.)
Францыск СКАРЫНА (1490 -1551 гг.)
Васіль БЫКАЎ (1924 - 2003 гг.)


Янка КУПАЛА (Іван Луцэвіч ) (1882 - 1942 гг.)
Якуб КОЛАС (Канстанцін Міцкевіч ) (1882 - 1956 гг.)
Уладзімір КАРАТКЕВІЧ (1930 - 1984 гг.)
Францыск СКАРЫНА (1490 -1551 гг.)
Васіль БЫКАЎ (1924 - 2003 гг.)